# УМОВЫ РАЗВІЦЦЯ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ, ПРАМЫСЛОВАСЦІ І ГАНДЛЮ НА ЗЕМЛЯХ ІВАЦЭВІЧЧЫНЫ У 1921–1939 гг.

**Тахіян Т.М.**
УО «Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна»

Пасля заканчэння польска-савецкай вайны і падпісанння 18 сакавіка 1921 г. Рыжскага мірнага дагавора землі Івацэвіччыны разам з іншымі тэрыторыямі Заходняй Беларусі былі ўключаны ў склад Польшчы. Івацэвіччына, падчас уваходжяння яе ў склад другой Рэчы Паспалітай з 1921 па 1939 г., выконвала функцыю эканамічнага прыдатка.

Да Першай сусветнай вайны і польскай акупацыі сельская гаспадарка Івацэвіччыны развівалася даволі інтэнсіўна. Была ярка выражана яе спецыялізацыя, у якой выдзялялася вытворчасць мяса-малочнай прадукцыі і збожжавых культур. Мясцовыя памешчыкі і заможныя гаспадары, якія валодалі дастатковай колькасцю зямлі, паступова ўводзілі перадавую для таго часу агратэхніку. У перыяд з 1921 па 1922 гг. значна пачалі скарачацца пасяўныя плошчы, у 1921–1922 г. яны складалі толькі 77,8 % да ўзроўню 1913 г. [1; 11]. Засталіся і феадальныя перажыткі, такія як буйное памешчыцкае землеўладанне, вялікая колькасць беззямельных і малазямельных сялянскіх гаспадарак, шырокае кола адпрацовачных павіннасцей, цяжкія падаткі, высокія цэны на прамысловыя тавары шырокага ўжытку і нізкія цэны на сельскагаспадарчыя прадукты, запазычанасць банкам.

Адсталая структура сельскай гаспадаркі і вялікія разбурэнні ў выніку ваенных дзеянняў прывялі да таго, што 64 % сельскіх жыхароў вялі натуральную гаспадарку пры дапамозе прымітыўных сельскагаспадарчых прылад. Толькі некаторыя памешчыцкія гаспадаркі мелі трактары. На адзін трактар прыходзілася прыкладна 8 тыс. га ворнай зямлі. Аднак трактары з-за дарагавізны паліва, запасных частак і нявыгаднасці трымаць работніка для іх абслугоўвання шырока не выкарыстоўваліся. У асноўным пасеў збожжавых культур ажыццяўляўся ўручную. Пры ўборцы і абмалоце збожжа выкарыстоўваліся косы, сярпы, цапы, драўляныя вілы. Некаторыя памешчыкі мелі конныя механічныя прывады. Сабраны ўраджай звозіўся ў гумны, а затым абмалочваўся. Сялянскія гаспадаркі пакутавалі ад нястачы жывёлы, што ў сваю чаргу ўплывала на колькасць арганічных угнаенняў, своечасовую і якасную апрацоўку зямлі і выкананне іншых сельскагаспадарчых работ. Каля 29 % сялянскіх гаспадарак не мелі коней, у 58,8 % было толькі па аднаму каню, 15,7 % адносіліся да бескароўных, 51,1 % гаспадарак валодалі адной каровай [2; 46].

Асноўнымі сельскагаспадарчымі культурамі на Івацэвіцкіх землях у польскі перыяд былі пшаніца, жыта і бульба. Каля 70 % пасяўных плошчаў знаходзілася пад збожжавымі культурамі і бульбай. Прычым, як адзначалася ў адной са справаздач, "жыта і бульбы ... было з лішкам". Аднак ураджайнасць знізілася ў параўнанні з даваеннай: пшаніцы – на 12 %, жыта – на 9,2 %, бульбы – на 32 % з га. Таксама змяніўся і памер пасяўных плошчаў, занятых пад сельскагаспадарчымі культурамі. Напрыклад, у 1925 г. пшаніцай было засеяна 28 % зямельных плошчаў (33,6 % – ў 1913 г.), жытам – 63,7 % (57,8 % – у 1913 г.), бульбай – 61,8 % (46 % – у 1913 г.) [3]. Пасевы льну і іншых тэхнічных культур былі нязначнымі. Плошчы пад шматгадовымі травамі ў сувязі з панаваннем трохпольнай сістэмы таксама займалі невялікую ўдзельную вагу. Тытунь наогул было забаронена вырошчваць [1; 37].

Тэхнічны прагрэс у сельскую гаспадарку Івацэвіччыны пранікаў паступова. У вёсках Косава, Заполле, Бусяж, Воля, Любішчыцы, Міневічы, Святая Воля, Глінна, Коланск, Целя-

ханы, Варанілавічы, Горталь і інш. (усяго ў 22 вёсках) пачалі дзейнічаць станцыі па ачыстцы насення. У 1931 г. на іх было ачышчана каля 758,2 т насення. З абсталявання на такіх станцыях працавалі па 1 веялцы і па 1 "змейцы". У вёсцы Заполле былі веялка, сячкарня, малацілка, у Варанілавічах – веялка і 3 культыватары, на некоторых былі жнейкі, у Міневічах, Косаве і Бусяжы – млынкі [4].

Сельскагаспадарчыя расліны цярпелі ад розных шкоднікаў. Найбольш распаўсюджанымі ў Косаўскім павеце былі галаўня і каларадскі жук. З мэтай барацьбы з апошнім была арганізавана спецыяльная акцыя сярод навучэнцаў школ. Сіламі вучняў было сабрана 3858 літраў каларадскага жука. За кожны здань літр выплачвалі 5 грошаў. Усяго за час правядзення акцыі было выплачана 192 злотых 50 грошаў [5].

Жывёлагадоўля прагрэсавала галоўным чынам у гаспадарках заможных сялян і памешчыцкіх маёнтках і насіла мяса-малочны характар. У адной са справаздач палескага ваяводства адзначалася, што "жывёлагадоўля на Івацэвіцкіх землях добра развіта. Палеская свіння пры скрыжаванні з англійскай пародай дае добры прыплод. Таму адсюль вывозяць многа мясной прадукцыі, якая вызначаецца высокай якасцю і экалагічнымі ўмовамі вытворчасці".

Акрамя свінаводства на Івацэвіцкіх землях развівалася і малочная жывёлагадоўля. Існавалі кааператывы вытворцаў малака. У Целяханах у такім кааператыве налічвалася 17 членаў і 23 каровы, у Коланску – 98 членаў і 294 каровы, у Косаве адпаведна – 40 і 90 (за 3 месяцы 1932 г. надаілі 21214 л малака), у Амельна і Святой Волі – 98 і 220 (за 11 месяцаў – 110582 л малака), у Целяханах – 109 і 115 (за 12 месяцаў 53140 л).

Для абслугоўвання жывёлагадоўлі на Івацэвіцкіх землях існавала ветэрынарная служба. У некаторых вёсках дзейнічалі ветэрынарныя амбулаторыі, якія знаходзіліся пад кіраўніцтвам і на ўтрыманні гміннай улады. У Косаве выдаткі на ўтрыманне такой амбулаторыі ў 1932 г. склалі 2400 зл., за год было абслужана 1026 розных жывёл. Выдаткі на Целяханскую амбулаторыю склалі 2300 зл., вылечылі 494 жывёлы, у Святой Волі адпаведна – 1450 зл. і 499 жывёл, і ў Івацэвічах – 1500 зл. і 839 жывёл. Лячылі коней, кароў, авечак, свіней, птушак, але найчасцей кароў [6].

Вялікай праблемай для беларускага селяніна былі падаткі. Падатковая сістэма была створана так, што дробныя гаспадаркі плацілі падатак большы, чым буйныя. Напрыклад, сяляне, ва ўласнасці якіх былі надзелы да 5 га, плацілі 2,38 злотых з 1 га зямлі, у той жа час уладальнікі буйных латыфундый – толькі 1,01 злотых, а астатнія гаспадаркі з зямельнай плошчай ад 15 да 50 га – 1,89 злотых [1; 47].

Уладальнікі зямельных надзелаў павінны былі выплачваць розныя віды падаткаў. Асноўнымі падаткамі былі дзяржаўны зямельны з дадаткам камунальным і на аплату дарог. Прычым першы залежаў ад памераў і якасці зямлі, якая падлягала падаткаабкладанню. Некаторыя павінны былі плаціць гмінныя падаткі, падаткі на "шыльды і анонсы". Напрыклад, у 1938 г. сяляне з в. Гошчава Бандарык Андрэй з 6,56 га зямлі заплаціў дзяржаўны зямельны падатак з дадаткам камунальным у памеры 21,09 злотых, Еўтух Тэадор – з 3,28 га 15,47 злотых, Еўтух Канстанцін – з 5,47 га 25,80 злотых, Еўтух Адам – з 2,74 га 13,69 злотых, Самсонік Анастас – з 1,64 га 9,04 злотых, Фядосік Ян – з 8,74 га 43,57 злотых [7].

Мясцовыя органы самакіравання прымалі актыўны ўдзел у стымуляванні развіцця сельскай гаспадаркі, выдаткоўвалі значныя сродкі на будаўніцтва і ўтрыманне дарог, а таксама на іншыя патрэбы сельскай гаспадаркі (на пункты пракату сельскагаспадарчай тэхнікі, закуп штучных ўгнаенняў). У 1924 г. мясцовым бюджэтам было прадугледжана

выдаткаваць 4,1 % сродкаў на развіццё сельскай гаспадаркі і 22, 9 % – на грамадскія работы, у 1925 г. адпаведна – 5,1 % і 19,5 %, у 1926 – 7,8 % і 25,8 % [8]. Павелічэнне выдаткаў садзейнічала паступоваму паспяховаму развіццю сельскай гаспадаркі на Івацэвіччыне. З мясцовых бюджэтаў выдзяляліся сродкі і на добраўладкаванне населеных пунктаў. Напрыклад, у 1932 г. на гэтыя мэты было выдаткавана ў Косаве – 150 злотых, у Івацэвічах – 400 злотых, у Святой Волі – 300, у Целяханах – 200 [9].

На Івацэвіччыне былі шырока распаўсюджаны сельскагаспадарчыя гурткі. Садзейнічала іх утварэнню і кантралявала дзейнасць Палескае павятовае таварыства зямельных арганізацый і гурткоў. Гурткі супрацоўнічалі з органамі ўлады, з дапамогай якіх стваралі пункты арэнды сельскагаспадарчых машын і інвентара. Па іх ініцыятыве ўтвараліся гандлёва-сельскагаспадарчыя (збытавыя) арганізацыі. Дзякуючы таварыству, Палескі рэгіён прымаў ўдзел у Познаньскай выставе-кірмашы і выставе ў Стакгольме.

Аддзяленні Палескага павятовага таварыства зямельных арганізацый і гурткоў былі ў многіх вёсках Косаўскага павета. Напрыклад, у в. Любішчыцы (10 членаў), у в. Руда (12 членаў), в. Альба (18), м. Косаў (14), в. Гошчава (14), в. Бусяж (33), в. Міхновічы (38), в. Заполле (20), в. Святая Воля (24), в. Глінна (25), в. Целяханы (25), в. Амельна. Сельскагаспадарчыя гурткі арганізоўвалі паказальныя палі, якіх ў Косаўскім павеце было 1,85 га, пункты ачысткі насення. Пад патранатам Палескага павятовага таварыства зямельных арганізацый існавалі і гурткі сельскай моладзі – у в. Серадава (11 членаў), м. Косава (18), Заполле (25), Альба (14), Бараны (23), Коланск-Амельна (18), Целяханы (15), Глінна (21).

Сельскагаспадарчыя гурткі займаліся асветніцкай працай сярод мясцовага вясковага насельніцтва, арганізоўвалі гутаркі і спецыяльныя курсы (у тым ліку, караткачасовыя на месцах) па сельскагаспадарчай тэматыцы, конкурсы па вырошчванню буракоў, азімых, капусты, кукурузы, а потым праводзілі паказальныя выставы па выніках конкурсаў. Напрыклад, такія паказы прайшлі ў Косаве – 25 кастрычніка 1931 г., у Целяханах – 31 кастрычніка 1931 г. 113 чалавек прадставілі на гэтых выставах свае сельскагаспадарчыя экспанаты, 84 з іх былі ўзнагароджаны за свае дасягненні. Стымулявалася развядзенне кветак на насенне (гэтым відам дзейнасці займаліся 54 чалавекі). У дапамогу сельскім вытворцам дзейнічалі крэдытна-ашчадныя касы ў Івацэвічах, Косаве, Целяханах, Святой Волі. Іх абаротны капітал складаў 174600 зл. [10].

Стымуляванне развіцця сельскай гаспадаркі і ўкаранення перадавых метадаў гаспадарання ажыцяўлялася за кошт правядзення конкурсаў і выстаў. Яны праводзіліся не толькі сельскагаспадарчымі гурткамі, але і па ініцыятыве мясцовых улад. Так, у 1932 г. праводзіўся конкурс сярод вясковай моладзі: па вырошчванню буракоў – у Заполлі, Косаве, Яглевічах, Святой Волі, Глінна, Соміна, Целяханах; па вырошчванню жыта – у Святой Волі і Амельна; морквы – у Целяханах і Альбе. Для самастойных гаспадарак конкурсы па вырошчванню буракоў адбыліся ў Альбе, Бусяжы, Выганашчах, Святой Волі, Лазоўцах; морквы – у Альбе; капусты – у Лазоўцах. У Косаве ўзялі ўдзел у конкурсе 84 чалавекі, у Целяханах – 38. У выніку пераможцамі сталі 36 чалавек, якія прадэманстравалі надзвычай высокую агратэхніку: буракоў сабралі 1059 ц/га, морквы – 390 ц/га, капусты – 430 ц/га. Для удзельнікаў конкурсаў былі арганізаваны асветніцкія курсы: 12 сакавіка 1933 г. у Целяханах, 20 сакавіка – у Косава. У іх ўзялі ўдзел 25 чалавек. Выкладалі на курсах аграрныя інструктары і навукоўцы з Кракава і Варшавы. Пасля заканчэння былі праведзены экзамены і ўзнагароджаны пераможцы конкурсаў. У якасці дробных узнагарод уручалі косы, сярпы, акучнікі, кнігі на сельскагаспадачую тэматыку. Вышэйшых узнагарод было 2:

бібліятэчкі па 50 сельскагаспадарчых кніг кожная на суму 145 злотых [11]. Прамысловасць на Івацэвіччыне ў 1921–1939 гг. была развіта даволі слаба, акрамя дрэваапрацоўваючых фабрык, і ў асноўным была накіравана на задавальненне мясцовых патрэб. Буйных прадпрыемстваў не было, толькі невялікія рамесныя майстэрні. У Косаўскім павеце налічвалася 27 цагельняў, 6 смалярняў, мноства млыноў (16 паравых, 26 ветраных, 3 турбінныя), 13 гарбарняў, 13 бойняў. У Косаве ў 1932 г. працавала друкарня, будаўнічае бюро, цагельня [12].

Значная частка лясоў на Івацэвіччыне належала прыватным уласнікам. Значныя ўчасткі лесу ў маёнтку Гошчава належалі Берчынскаму, Барадоўскаму, Каралю Вендзягельскаму, Стэфану Карзону, у маёнтку Обрава – братам Кажланінавым, Бурнасавай, у маёнтку Глінна 2 – Юзефу Ліпскаму, у маёнтку Целяханы – Якубу Шчырынскаму і Каралю Пуслоўскаму, у маёнтку Глінна – Мікалаю Шамбаранту, у маёнтку Харошча – Марыі Слізень, у маёнтку Івацэвічы – Антону і Антынегу Юндзілам, у маёнтку Косаў – фірмам “Хеллер” і “Барадоўская-Бунімовіч”, у маёнтку Косаў-Зенапаль – прамыслова-сельскагаспадарчаму таварыству “Зенапаль”, у вёсцы Боркі – царкве, у Косаве-Палескім – парафіі [13].

Лес заўсёды меў на Івацэвіччыне вялікае значэнне, быў асновай многіх промыслаў, а зрэдку з'яўляўся адзінай крыніцай заробку людзей. Найчасцей лес выкарыстоўвалі для вытворчасці драўніны. У Целяханах існавалі лясныя промыслы, на якія найmaліся жыхары навакольных вёсак. Асноўнымі відамі працы на промыслах былі нарыхтоўка драўніны, габляванне, абмер, штабляванне дошак і трэсак, скрабенне. Заробак рабочых у дзень складаў ад 2,30 да 3 злотых у залежнасці ад складанасці працы. Падаходны падатак налічваўся ў памеры 6,6 %. У маі 1939 г. на промыслах працавалі Бігун Арон, Гурбел Берко, Лайфер Леймо, Рубінштэйн Берко [14].

14 чэрвеня 1928 г. у Івацэвічах было ўтворана Рамеснае таварыства. На яго чале стаяла праўленне з 5 чалавек. У 1934 г. у таварыстве налічвалася 39 членаў. Членскі ўзнос складаў 50 грошаў. Мэтамі аб'яднання рамеснікаў былі павышэнне іх культурна-асветніцкага ўзроўню, прафесійнай адукацыі, а таксама абарона грамадска-арганізацыйных і гаспадарчых інтарэсаў рамеснікаў. Статут рамеснага таварыства ў Івацэвічах ад 13 снежня 1929 г. прадугледжваў арганізацыю курсаў, бібліятэк, выстаў, адкрыццё бурсы, правядзенне чытанняў, апеку рамеснай моладзі, выданне рамеснага часопісу, стварэнне складу і гандлёвага дому, кансультацыі членаў таварыства па прававых, гандлёвых і тэхнічных пытаннях, пошук рынкаў збыту для тавараў таварыства, стварэнне крэдытна-ашчаднай касы. Штогод у павятовае староства праўленне рамеснага таварыства павінна было падаваць справаздачу [15].

Наяўнасць на Івацэвіччыне вялікай колькасці рэк і азёр абумовіла развіццё рыбаводства і рыбалоўства. Прыватныя рыбныя абводы ў 1932–1939 гг. існавалі ва ўрочышчы Мерачоўшчына, на азёрах Вулька, Бабровіцкім і Выганашчанскім, на Агінскім канале. На рацэ Грыўда дзейнічалі 6 рыбных абводаў [16]. Рыбакі атрымлівалі ад мясцовых улад (ад павятовага старасты) спецыяльныя “рыбацкія карты” – дазволы на ажыццяўленне сваёй дзейнасці. З мэтай рацыянальнага выкарыстання водных багаццяў краю, рыбакі аб'ядноўваліся ў прафесіянальныя суполкі. У 1932–1935 гг. у Івацэвічах (ва урочышчы Белы Двор) на добраахвотнай аснове было ўтворана таварыства рыбакоў, якое атрымала дазвол на ажыццяўленне рыбалоўства на 518 га азёр (уваходзіла ў склад 13 чалавек) [17].

1 лютага 1939 г. рыбакі азёр Бабровічы, Выганашчы, Вулькаўскае, Гутка (уласнасць К. В. Пуслоўскага) утварылі таварыства “Кола рыбакоў у Бабровічах і Выганашчах” з мэтай добрай арганізацыі рыбалоўства, абароны інтарэсаў рыбакоў, кантролю за рацыянальным гаспадараннем на азёрах, барацьбы з грабежніцкімі спосабамі рыбалоўства. На

прыватных азёрах Пуслоўскага кожны рыбак павінен быў плаціць 30 грошай за кілаграм вылаўленай рыбы. 35 удзельнікаў "Кола рыбакоў..." прасілі мясцовыя ўлады "дазволіць ім займацца рыбалоўствам на тых жа ўмовах і як мага хутчэй выдзяліць ім абводы, на якіх бы яны маглі займацца рыбным промыслам, а таксама не дапускаць да перакупу рыбы жыдоў". 6 сакавіка 1939 г. прадстаўнікі "Кола рыбакоў у Бабровічах і Выганашчах" бралі ўдзел з сходзе вытворцаў стаўковай рыбы, які адбыўся ў Варшаве. На сходзе былі абмеркаваны наступныя праблемы: арганізацыя гандлю рыбай, значэнне рыбнага рынку, імпарт рыбы, метады падліку рыбы ў ставах, вопыт выкарыстання мелу і фосфару пры развядзенні рыбы і інш. 31 сакавіка 1939 г. дэлегацыя "Кола рыбакоў..." удзельнічала ў рыбацкіх курсах у Слоніме. Там было адзначана, што "азёры ў Бабровічах і Выганашчах абслугоўваюць баранавіцкія і слонімскія рынкі, на якіх ваяводскі аддзел вытворчасці рыбы пры сельскагаспадарчай палаце адчыніў свае крамы, таму праблема эксплуатацыі дадзеных азёр мае для ўлад першараднае значэнне" [18].

Івацэвіцкія землі ў часы другой Рэчы Паспалітай не з'яўляліся значным цэнтрам гандлю. Мясцовы гандаль развіваўся вельмі марудна. З дадзенай тэрыторыі экспартавалі дрэва і піламатэрыялы, збожжа, жывёлу, мяса, сена, масла, яйкі, скуры і інш. Імпартавалі пераважна прамысловыя тавары, а са збожжавых – манныя крупы і проса [19].

На прамысловыя тавары шырокага ўжытку былі ўстаноўлены вельмі высокія цэны, затое былі нізкія цэны на сельскагаспадарчыя прадукты. Напрыклад, 10 кВт электраэнергіі каштавалі 7,3 злотага, 1 л газы каштаваў 35 грошаў. У той жа час 100 кг збожжа каштавалі ў сярэднім 12 злотых, рабочы конь – 150–200 злотых, дойная карова – 100–120 злотых.

Прадукцыя рамяства ў асноўным прызначалася для мясцовага рынку, але мела некаторы збыт і сярод іншаземцаў, але дрэнная арганізацыя гандлю не дазваляла дасягнуць значных паказчыкаў у гандлі. Для актывізацыі гандлю ў 1922 г. быў арганізаваны Саюз купцоў у Варшаве, які ў 30-я гг. XX ст. меў свае аддзелы ў Целяханах (25 членаў) і ў Косава (178 чал). Такім аддзелам кіравала праўленне з 6 чалавек, у якое ўваходзілі старшыня, віцэ-старшыня, сакратар і 3 члены праўлення. Напрыклад, у Косава-Палескім у склад праўлення ўвайшлі 3 прамыслоўцы, 2 купцы і 1 чыноўнік. Спачатку членскі ўзнос складаў 25 грошаў, а пазней – ў 1932 г. – узрос да 50 грошаў. Вызначаную квоту ўзносаў адпраўлялі для Цэнтральнага адзела саюза купцоў у Варшаве. Напрыклад, у 1932 г. такая квота склала 49 злотых [20]. Дзейнасць саюза купцоў была накіравана на арганізацыю новых метадаў гандлю, на інфармаванне членаў аб актуальных падатковых і адміністрацыйных новаўвядзеннях, на супрацоўніцтва з ўрадам і ўкараненне членаў саюза ў органы ўлады, на падтрыманне кантактаў з іншымі купецкімі аб'яднаннямі.

Такім чынам, сельская гаспадарка Івацэвіччыны ў 1921–1939 гг. увогуле захоўвала рысы аграрнай і тэхнічнай адсталасці, насіла экстэнсіўны характар. Нізкі ўзровень развіцця вытворчых сіл, недастатковасць арганічных і мінеральных угнаенняў, выкарыстанне ў большасці сялянскіх гаспадарак драўлянага плуга з жалезным лемехам не спрыялі інтэнсіўнаму развіццю сельскай гаспадаркі. Значныя поспехі ў сельскагаспадарчай вытворчасці мелі буйныя памешчыкі і заможныя сяляне, а роля дробных вытворцаў, якія складалі каля 74 % усіх гаспадарак, зводзілася да пастаяннага пошуку сродкаў існавання.

Івацэвіччына як і ўся тэрыторыя Заходняй Беларусі выкарыстоўвалася Польшчай пераважна як крыніца сыравіны і таннай працоўнай сілы, як рынак збыту для яе прамысловых тавараў. Працоўныя пакутавалі і ад эксплуатацыі, і ад нацыянальнага прыгнёту. Разбураная войнамі прамысловасць аднаўлялася марудна, новыя прадпрыемствы амаль не будаваліся, прыродныя багацці краю, асабліва лясы, няшчадна рабаваліся, часта распрадаваліся замежным

фірмам. Многія галіны прамысловасці так і не дасягнулі ўзроўню 1913 г. У 1928 г. на большасці прадпрыемстваў працавала ад 5 да 20 чалавек. У гады эканамічнага крызісу часова спынілі работу мноства прадпрыемстваў, беспрацоўе стала хранічным. У прамысловасці, на транспарце і лесараспрацоўках было занята ўсяго каля 5 % рабочых. Рабочы дзень дасягаў 10–12 гадзін, зарплата была ў два разы ніжэйшая, чым у карэннай Польшчы.

**Літаратура**

1. Кухарев, Б.Е. Сельское хозяйство Белоруссии (1919 – 1939 гг.) / Б.Е. Кухарев. – Минск: Высшая школа, 1975. – 14 с.

2. Грэсь, С. М. Аграрныя пераўтварэнні ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. Дыс. на суіск. вуч. ступені канд. Гіст. навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя. – Гродна, 2007.

3. ДзАБВ. Ф. Р–60. – Воп. 4. – Спр. 13. – Арк. 8. Справаздачы пра дзейнасць Палескага акружнога зямельнага ўпраўлення (1921–1927 гг.).

4. ДзАБВ. Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 1030. – Арк. 27. Справаздача Косаўскага павятовага камунальнага саюза аб дзейнасці і выкананні бюджэта за 1932–1933 гг.

5. ДзАБВ. Ф. 263. – Воп. 1. – Спр. 67. – Арк. 5. Палескае павятовае таварыства зямельных арганізацый і гурткоў 1931–1932 гг.).

6. ДзАБВ. Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 1030. – Арк. 38. Справаздача Косаўскага павятовага камунальнага саюза аб дзейнасці і выкананні бюджэта за 1932–1933 гг.

7. ДзАБВ. Ф. 318. – Воп. 1. – Спр. 3. – Арк. 1, 6, 8, 31, 32, 60. Падаткі за 1938 г. у в. Гошчава Косаўскага павета.

8. ДзАБВ. Ф. Р–60. – Воп. 4. – Спр. 13. – Арк. 11. Справаздачы пра дзейнасць Палескага акружнога зямельнага ўпраўлення (1921–1927 гг.).

9. ДзАБВ. Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 1030. – Арк. 43. Справаздача Косаўскага павятовага камунальнага саюза аб дзейнасці і выкананні бюджэта за 1932–1933 гг.

10. ДзАБВ. Ф. 263. – Воп. 1. – Спр. 67. – Арк. 3–5аб. Палескае павятовае таварыства зямельных арганізацый і гурткоў за 1931–1932 гг.

11. ДзАБВ. Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 1030. – Арк. 30. Справаздача Косаўскага павятовага камунальнага саюза аб дзейнасці і выкананні бюджэта за 1932–1933 гг.

12. ДзАБВ. Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 1030. – Арк. 4, 59–60. Справаздача Косаўскага павятовага камунальнага саюза аб дзейнасці і выкананні бюджэта за 1932-1933 гг.

13. ДзАБВ. Ф. 1. – Воп. 7. – Спр. 576–509, 603–611. Справы аб надзоры за лесам ў Косаўскім павеце.

14. ДзАБВ. Ф. 318. – Воп. 1. – Спр. 42а. – Арк. 2. Плацёжныя ведамасці на выдачу зарплаты работнікам, занятым на лясных промыслах у Целяханах за 1939 г.

15. ДзАБВ. Ф. Р–605. – Воп. 1. – Спр. 9. – Арк. 1, 2. Статут рамеснага таварыства ў Івацэвічах.

16. ДзАБВ. Ф. 1. – Воп. 7. – Спр. 300.– Арк. 165–166. Рашэнні і аб'явы Палескага ваяводы аб адкрыцці новых абводаў для рыбалоўства 1938–1939 гг.

17. ДзАБВ. Ф. 1. – Воп. 7. – Спр. 302. – Арк. 116. Звесткі аб вадзяных млынах, рыбных вадаёмах і рыбных аб'яднаннях 1932–1935 гг.

18. ДзАБВ. Ф. 1. – Воп. 7. – Спр. 299. – Арк. 64–76. Фінансавыя справаздачы аб ахове рыбалоўства і перапіска сельскагаспадарчай палаты і павятовых стараст па пытаннях рыбалоўства 1938–1939 гг.

19. ДзАБВ. Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 1030. – Арк. 5. Справаздача Косаўскага павятовага камунальнага саюза аб дзейнасці і выкананні бюджэта за 1932–1933 гг.

20. ДзАБВ. Ф. Р–605. – Воп. 1. – Спр. 8. – Арк. 3–5. Справаздачы аб дзейнасці Саюза купцоў (аддзел у Косаве-Палескім).